УДК 271.22(476.5)(091)“18/19”

*У. Я. Аўсейчык*

# Старaверы Полацкага павета ў сярэдзіне XIX — пачатку XX ст.: асаблівасці рассялення і дэмаграфічная характарыстыка

*Ў артыкуле разгледжаны асаблівасці месцавання стараверскага насельніцтва на тэрыторыі Полацкага павета Віцебскай губерні ў сярэдзіне XIX — пачатку XX стагоддзяў. Выяўлены асноўныя арэалы пражывання, прасочана дынаміка колькасці і рассялення стараверaў. Крыніцамі для даследавання стаў комплекс статыстычных матэрыялаў і архіўных дадзеных.*

Ключавыя словы: *старaверы, этнічныя групы, Беларусь, рассяленне, дэмаграфія, этнакультурныя працэсы.*

Гісторыя стараверства на беларускіх землях пачынаецца ў другой палове XVII ст. Царкоўная рэформа патрыярха Нікана ў сярэдзіне XVII ст. выклікала раскол у рускай праваслаўнай царкве. Значная частка вернікаў не прыняла новаўвядзенняў, за што падверглася рэпрэсіям і ганенням. Уцякаючы ад праследу, прыхільнікі старых абрадаў былі вымушаны нават эміграваць за межы Расіі. Адным з накірункаў эміграцыі рускіх стараверaў сталі беларускія землі, якія ў той перыяд увходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага.

Пачынаючы з другой паловы XVII ст. на тэрыторыю Беларусі перасялілася значная колькасць стараверaў. Іх рассяленне на беларускіх землях не было раўнамерным. Гістарычна склалася так, што асноўныя стараверскія цэнтры сфарміраваліся ў паўночным і паўднёва-ўсходнім рэгіёнах краіны. Адным з рэгіёнаў пасялення стараверaў сталі землі Полаччыны. Фрагментарнасць крыніц не дазваляе прадставіць дэмаграфічную характарыстыку стараверскага насельніцтва ў рэгіёне ў раннія перыяды (у другой палове XVII — XVIII стст.). Маюцца толькі некаторыя звесткі аб іх знаходжанні тут у гэты перыяд. Паасобныя даныя аб іх колькасці і месцах рассялення адносяцца да другой паловы XVIII — пачатку XIX ст. Больш поўныя і сістэмныя даныя з’яўляюцца ў сярэдзіне XIX ст.

Мэта дадзенага артыкула — выявіць арэалы рассялення стараверскага насельніцтва на землях Полаччыны і ахарактарызаваць яго колькасны




*Мал. 1.* **Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел у паўночнай частцы Беларусі і сумежных тэрыторый у другой палове XIX — пачатку XX ст.**

склад у сярэдзіне XIX — пачатку XX ст. Геаграфічныя межы даследавання ахопліваюць тэрыторыю Полацкага павета Віцебскай губерні (*мал. 1*). Аднак для выяўлення асаблівасцей працякання дэмаграфічных працэсаў у працы нярэдка супастаўляюцца даныя з іншымі беларускімі паветамі Віцебскай губерні. Крыніцазнаўчай базай даследавання стаў комплекс статыстычных і дэмаграфічных матэрыялаў па стараверскаму насельніцтву рэгёна ў другой палове XIX — пачатку XX ст. Менавіта гэты перыяд характарызуецца наяўнасцю дастатковай колькасці даных, якія дазваляюць дасягнуць пастаўленай мэты.

Першыя афіцыйныя звесткі аб колькасці старавераў па губернях Расійскай імперыі адносяцца яшчэ да сярэдзіны 1820-х гг. Пачынаючы з 1826 г. Міністэрства ўнутраных спраў збірала і сістэматызавала даныя аб колькасці стараверскага насельніцтва па губернях Расіі. А таму з гэтага часу маюцца даныя і аб колькасці старавераў у беларускіх губернях (*табл. 1*). Пры гэтым неабходна адзначыць, што да дакладнасці гэтых лічбаў трэба ставіцца з асцярожнасцю. Пытанні аб даставернасці афіцыйнага падліку старавераў пастаянна ўзнікалі не толькі ў даследчыкаў стараверства, але і ў супрацоўнікаў дзяржаўных органаў, якія збіралі і сістэматызавалі гэтыя даныя ў гэты перыяд [1, с. 179—180].

*Табл. 1.* **Дынаміка колькасці стараверскага насельніцтва ў беларускіх губернях (1826—1846 гг.)**[1]

| Год | Колькасць старавераў у губернях (чал.) | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Віленская | Віцебская | Магілёўская | Мінская | Гродзенская |
| 1826 | 18 121 | 37 752 | 6 843 | 3 777 | 4 |
| 1827 | 21 071 | 37 246 | 8 044 | 4 670 | 4 |
| 1837 | 21 265 | 36 017 | 8 589 | 7 590 | - |
| 1839 | 21 394 | 36 899 | 8 714 | 7 122 | - |
| 1841 | 23 152 | 38 432 | 14 200 | 7 706 | - |
| 1846 | 10 976 | 38 735 | 14 668 | 4 151 | - |

Больш поўныя і сістэмныя даныя аб колькасці старавераў і месцах іх пражывання на беларускіх землях адносяцца да канца 1830-х гг. Згодна з прадпісаннем міністра ўнутраных спраў Расійскай імперыі ад 24 кастрычніка 1835 г. у губернях штогод павінна была збірацца інфармацыя аб колькасці старавераў і іх храмаў і прадастаўляцца ў міністэрства [19, с. 151—152]. У адпаведнасці з гэтым прадпісаннем ажыццяўляўся збор даных па губернях, паветах і асобных населеных пунктах. Таму з гэтага часу маецца даволі сістэмная інфармацыя аб колькасці старавераў і месцах іх пражывання на тэрыторыі Полацкага павета. У Табліцы 2 прадстаўлены даныя аб колькасці старавераў у Полацкім павеце, а таксама ў іншых беларускіх паветах Віцебскай губерні ў 1837—1843 гг.

*Табл. 2.* **Колькасць старавераў у беларускіх паветах Віцебскай губерні (1837—1843 гг.)**[2]

| Год | Колькасць старавераў у паветах Віцебскай губерні (чал.) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Віцебскі | Гарадоцкі | Дрысенскі | Лепельскі | Полацкі | Усяго |
| 1837 | 1 747 | 406 | 49 | 615 | 3 281 | 6 098 |
| 1838 | 1 792* | 262 | 163 | 498 | 3 321 | 6 036 |
| 1843 | 1 852 | 254 | 238 | 593 | 3 934 | 6 871 |

* Згодна з Рапартам, за 1838 г. па Віцебскаму павету (без горада) былі пададзеныя звесткі за 1837 г., бо не паспелі зрабіць падлікі ў гэтым годзе. Але даныя па горадзе Віцебску былі пададзены ўжо за 1838 г. [2, арк. 77—78].

Як бачна з прыведзеных у *табл. 2* даных, асноўная колькасць стараверскага насельніцтва беларускіх земляў Віцебскай губерні пражывала ў Полацкім і Віцебскім паветах (каля 80% ад усёй колькасці). З канца 1830-х гг. да сярэдзіны 1860-х гг. лідарам па колькасці старавераў быў Полацкі павет (такая сітуацыя захоўвалася да 1880-х гг., гл. ніжэй). У сярэдзіне XIX ст. у павеце налічвалася каля паловы ўсіх прыхільнікаў «старой веры»,

[1] Табліца складзена аўтарам паводле: [1, с. 160, 163, 170—171, 173, 374, 376, 378, 446—447].
[2] Табліца складзена аўтарам паводле: [2, арк. 24—91а; 4, арк. 96 аб—97; 9, с. 613; 11, с. 292—293].

што фіксаваліся ў беларускай частцы Віцебскай губерні. Большасць стараавераў Полацкага павета ў гэты перыяд пражывала ва ўсходняй часцы павета (у сучасны перыяд памежжа Полацкага і Шумілінскага раёнаў). Некаторая колькасць была сканцэтравана ў арэале на поўначы ад Полацка, цэнтрам якога была в. Жарцы. Так, у 1843 г. у вёсцы пражывала 267 стараавераў [4, арк. 13]. Невялікі куст стараверскіх вёсак размяшчаўся на поўдні ад Полацка ў ваколіцах возера Гомель. На 1843 г. у Полацкім павеце стараверы пражывалі ў больш чым ста населеных пунктах. Да сярэдзіны 1860-х гг. колькасць вёсак у павеце, дзе фіксаваліся стараверы, некалькі вырасла, але не так істотна [18; 4, арк. 17]. На аснове статыстычных даных канца 1830-х — першай паловы 1860-х гг. складзена карта-схема рассялення старавераў на беларускіх землях Віцебскай губерні (*мал. 2*).

Большасць старавераў Віцебскай губерні адносіліся да беспапоўскага толку. У рэгіёне пражывалі федасееўцы, філіпоўцы і паморцы. Праўда, у афіцыйных дакументах таго часу, што змяшчалі статыстычныя даныя, беспапоўскія сагласы называліся вельмі рэдка. Часцей у рознага шэрагу рапартах і справаздачах стараверы-беспапоўцы ўпаміналіся як «старобрядцы, не приемлющие священство», «раскольники, не признающие священства», «раскольники, не приемлющие священство, но поклоняющиеся иконом», «секта безпоповщины», або проста «безпоповщина» ці «безпоповцы». Часам яны вызначаліся як «Филипоны» ці «Пилипоны» [2, арк. 40; 3, арк. 6]. У Полацкім павеце, як сведчаць архіўныя крыніцы, старавераў-папоўцаў амаль не налічвалася. У дакументах таго часу старавераў Полацкага павета характарызавалі як «раскольники, не приемлющие священство, но поклоняющиеся иконам» [2, арк. 66].

У сярэдзіне XIX ст. большасць стараверскага насельніцтва Полацкага павета, як і іншых беларускіх паветаў Віцебскай губерні, з'яўляліся вясковымі жыхарамі. Як сведчаць статыстычныя даныя, сярод гарадоў Віцебскага, Полацкага, Гарадоцкага, Дрысенскага і Лепельскага паветаў стараверскае насельніцтва пражывала толькі ў Віцебску і Полацку. У іншых беларускіх павятовых цэнтрах Віцебскай губерні стараверы не пражывалі (зусім невялікая колькасць старавераў па розных гадах налічвалася яшчэ ў Гарадку). У справаздачных дакументах таго часу даволі характэрнай была фармуліроўка, што ў астатніх гарадах, апроч Віцебска і Полацка, «раскольников и их церквей не находится» [2, арк. 22, арк. 26]. Нават у канцы 1830-х гг. колькасць старавераў у Полацку і Віцебску, а таксама іх доля ў агульнай колькасці старавераў павета была даволі значная. Так, у 1838 г. у Полацку налічвалася 266 чалавек, што складала 8% ад агульнай колькасці старавераў у павеце, а ў 1843 г. — 284 (7,22%) [2, арк. 6; 4, арк. 96 аб—97]. Лідарам па колькасці старавераў сярод беларускіх гарадоў




*Мал. 2.* Арэалы рассялення стараавераў у межах беларускіх паветаў Віцебскай губерні ў сярэдзіне XIX ст. (карта складзена аўтарам)

Віцебскай губерні быў Віцебск. Так, у 1837 г. тут пражывала 670 стараавераў, што складала 38,35% ад агульнай іх колькасці ў павеце. А ў 1843 г. у горадзе налічвалася 679 прыхільнікаў старых абрадаў (36,66% ад агульнай колькасці) [2, арк. 70; 4, арк. 96 аб—97]. Аднак ужо ў 1860-я гг., як сведчаць статыстычныя даныя, колькасць стараавераў у Полацку і Віцебску скарацілася. Так, у 1865 г. у Віцебску налічвалася толькі 392 чалавекі, а ў Полацку — 103. Гэта памяншэнне носіць выключна фармальны характар, паколькі ў гарадах у гэты час налічвалася значная колькасць аднаверцаў. Так, у тым жа 1865 г. у Віцебску іх пражывала 765 чалавек, а ў Полацку — 306 [11, с. 292]. Як сведчаць данясенні мясцовых уладаў, вялікая колькасць аднаверцаў у Полацку і Віцебску была толькі «на паперы». У рэальнасці ж, як сведчаць крыніцы, яны ў аднаверскія храмы не хадзілі, на споведзі не бывалі і прычасця не прымалі. Так, у канцы 1850-х гг.

у Полацку назіралася наступная сітуацыя: «В городе Полоцке цифра единоверцев на бумаге весьма значительна, но никто из них не бывает в святой единоверческой церкви, кроме причта и церковного старосты. Даже в годовые праздники Рождества и Воскресения Спасителя, собрание единоверцев, как все утверждают, не превышает 6—10 человек» [7, арк. 103].

У канцы 1830—1860-х гг. колькасць стараверскіх храмаў у беларускіх паветах Віцебскай губерні была невялікая. У гэты перыяд малельні старавераў налічваліся толькі ў Полацкім і Віцебскім паветах, а таксама ў гарадах Полацку і Віцебску. У Рапарце ад 24 снежня 1838 г. згадваецца пра адну стараверскую «часовню», якая знаходзілася ў в. Падлазнікі Віцебскага павета. Аднак, згодна з данымі за 1843 г., стараверскіх малельняў у павеце ўжо не налічвалася [2, арк. 22, арк. 76; 4, арк. 96 аб—97]. На 1840 г. у Віцебску налічвалася 3 стараверскія малельні (2 папоўцаў і 1 беспапоўцаў) [3, арк. 87]. Але ўжо ў 1843 г. у горадзе, згодна з афіцыйнымі данымі, была толькі адна каменная малельня беспапоўцаў (у 1-й частцы горада) [4, арк. 5 аб]. Найбольшая колькасць стараверскіх храмаў знаходзілася ў Полацкім павеце. Так, у 1840 г. у Полацку была 1 малельня, яшчэ 4 у павеце [3, арк. 162 аб—164]. Даныя за 1843 г. таксама сведчаць аб адной стараверскай малельні ў Полацку і яшчэ 4 у павеце. Архіўныя матэрыялы таксама даюць звесткі яшчэ аб аб 2 «часовнях» у павеце [4, арк. 13—17]. У дакументах адзначана, што ў 1840-х гг. у Полацкім павеце дзейнічалі храмы ў Жарцах, Канстанцінаве, Сідараўшчыне, Шмане, Латкаве і Забор'і [5, арк. 3]. У Гарадоцкім, Лепельскім і Дрысенскім паветах стараверскіх храмаў у гэты перыяд не фіксавалася.

На працягу 1840—1850-х гг. назіраецца закрыццё стараверскіх храмаў і перавод саміх старавераў у аднаверцы. Так, ужо ў сярэдзіне 1860-х гг. у рэгіёне функцыянавалі 3 аднаверскія цэрквы. Дзве з іх былі ў Віцебску (Благавешчанская і Успенская, якая была перабудавана ў 1852 г. з малельні беспапоўцаў) і адна ў Полацку (Свята-Духаўская, пабудаваная ў 1858 г.) [7, арк. 103—103 аб; 8, с. 384]. У той жа час у 1866 г. згадана толькі малельня ў в. Забор'е Міхайлоўшчынскай валасці Полацкага павета (запячатана ў 1865 г.; ахарактарызавана як «безымянная», пабудаваная яшчэ ў 1812 г.). Акрамя яе ў данясеннях паліцэйскіх упраў згадваецца па Полацкаму павету аб зусім разбураных стараверскіх храмах у в. Жарцы і в. Латкава [8, с. 387—388].

У другой палове XIX — пачатку XX ст. колькасць стараверў у беларускіх паветах Віцебскай губерні актыўна расце. З пачатку 1860-х гг. да пачатку XX ст. яно павялічылася больш чым у чатыры разы. У гэты перыяд значнай была і колькасць аднаверцаў. У табліцы 3 прадстаўлены даныя аб колькасці стараверaў і аднаверцаў у беларускіх паветах Віцебскай губерні.

***Табл. 3. Размеркаванне старавераў і аднаверцаў па беларускіх паветах Віцебскай губерні (1861—1902 гг.)***[3]

| Год | Колькасць стараверaў у паветах Віцебскай губерні (чал.) | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Віцебскі | | Гарадоцкі | | Дрысенскі | | Лепельскі | | Полацкі | | Усяго | |
| | Стараверы | Аднаверцы | Стараверы | Аднаверцы | Стараверы | Аднаверцы | Стараверы | Аднаверцы | Стараверы | Аднаверцы | Стараверы | Аднаверцы |
| 1861 | 1 412 | 322 | 225 | 115 | 268 | 17 | 367 | 13 | 2 141 | 1 157 | 4 413 | 1 594 |
| 1863 | 2 040 | 520 | 208 | 114 | 218 | - | 611 | 16 | 3 753 | 295 | 6 830 | 945 |
| 1865 | 2 167 | 813 | 427 | 163 | 256 | - | 812 | - | 3 626 | 455 | 7 288 | 1 431 |
| 1882 | 3 740 | 807 | 496 | 372 | 257 | - | 799 | - | 3 591 | 161 | 8 883 | 1 340 |
| 1886 | 3 947 | 1011 | 507 | 413 | 262 | - | 741 | - | 3 713 | 252 | 9 170 | 1 676 |
| 1894 | 4 177 | 1 305 | 642 | 423 | 274 | 2 | 541 | 1 | 4 528 | 65 | 10 162 | 1 796 |
| 1897 | 6 622 | * | 734 | * | 373 | * | 844 | * | 5 953 | * | 14 526 | * |
| 1902 | 8 403 | 1 376 | 2 080 | 92 | 385 | - | 997 | - | 5 999 | 125 | 17 864 | 1 593 |

* *Па перапісе 1897 г. аднаверцы прадстаўлены разам з праваслаўнымі і асобна не вылучаны.*

Як бачна з прыведзеных у табліцы 3 даных, лідарамі па колькасці стараверaў у рэгіёне па-ранейшаму былі Віцебскі і Полацкі паветы. У іх пражывала звыш 80% ад усіх стараверaў беларускай часткі Віцебскай губерні. Даныя сведчаць аб тым, што з 1880-х гг. лідарства па ліку староверскага насельніцтва пераходзіць да Віцебскага павета. Калі ў 1880—1890-я гг. колькасць стараверaў у Віцебскім павеце нязначна перавышала колькасць стараверaў у Полацкім павеце, то ў пачатку XX ст. гэты разрыў стаў больш істотным. Акрамя таго, у Віцебскім павеце ў гэты перыяд налічвалася значная колькасць аднаверцаў.

У канцы XIX — пачатку XX ст. у Расійскай імперыі прадпрымаліся спробы па складанні карты рассялення стараверaў. Гэта датычылася і беларускіх земляў. Так, у 1904 г. віцебскаму губернатару быў накіраваны ліст ад дырэктара дэпартамента агульных спраў, у якім прадугледжвалася складанне карты рассялення стараверaў па Расіі: «должна быть составлена карта с обозначением на ней современного положения раскола в отдельных местностях Империи». Разам з лістом дасылалася карта Віцебскай губерні, на якой прадугледжваліся наступныя абазначэнні староверства ў губерні: «1) городов, сел и деревень, в коих проживают раскольники, подчеркнуть эти поселения красными чернилами …; 2) всех молитвенных

[3] Табліца складзена аўтарам паводле: [9, с. 613; 10, с. 282—283; 11, с. 292—293; 12, с. 164—169; 13, с. 168—173; 14, с. 85; 16, с. 74; 15, с. 90—95].

зданий раскольников, обозначив их число в каждом селении отдельными красными крестами; 3) места жительства раскольнического лжеепископа если таковой имеется, отметив его красным кружком». Гэты запыт быў перапраўлены ў Полацкую духоўную кансісторыю, на які прыйшоў наступны адказ: «Вследствие сего и имея ввиду, что по многочисленности поселений старообрядцев в витебской губернии, особенно в уездах Режицком, Люцинском, Себежском и Двинском нет возможности обозначить все эти селения на полученной карте» [6, арк. 1—3]. У адказ кансісторыя накіравала спіс населеных пунктаў, дзе пражывалі стараверы. Так, згодна з гэтымі данымі, на тэрыторыі Полацкага павета налічвалася каля 100 населеных пунктаў, дзе фіксавалася стараверскае насельніцтва У гэты перыяд у павеце было зафіксавана 5 стараверскіх малельняў: у Полацку, Забор'і, Латкаве, Шмане і Жарцах. Як вынікае з аналізу прадстаўленых даных, на пачатку XX ст. на тэрыторыі Полацкага павета пражывалі ў асноўным стараверы-беспапоўцы федасееўскага сагласу. Толькі ў межах Станіслаўскага прыходу (інфармацыя, прадстаўленая Полацкай духоўнай кансісторыяй, была згрупіравана не па адміністрацыйных адзінках, але ў адпаведнасці з сістэмай праваслаўных прыходаў) фіксаваліся стараверы-філіпаўцы [6, арк. 11—11 аб].

Як сведчаць крыніцы, Віцебскім губернскім праўленнем на працягу 1907 г. на тэрыторыі Полацкага павета было зарэгістравана 7 стараверскіх абшчын. З іх 6 абшчын значыліся ўжо як абшчыны старапаморскага сагласу («старообрядческая община безпоповского старопоморского согласия»): Сідараўшчынская (17 кастрычніка 1907 г.), Латкаўская (17 мая 1907 г.), Полацкая (17 мая 1907 г.), Жарэцкая (30 мая 1907 г.), Шманаўская (9 чэрвеня 1907 г.), Жалудоўская (3 жніўня 1907 г.). У сваю чаргу Заборская абшчына была зарэгістравана 22 сакавіка 1907 г. як «старообрядческая община безпоповского поморского согласия» [20, с. 623; 21, с. 994; 22, с. 1025; 23, с. 1053; 24, с. 1101]. Такая ж колькасць абшчын у Полацкім павеце, згодна са справаздачай Полацкага епархіяльнага місіянера, фіксавалася і ў 1909 г. [17, с. 342].

Такім чынам, на аснове аналізу крыніц прыходзім да наступных высноў. Значная частка стараверскага насельніцтва паўночна-ўсходняй Беларусі ў сярэдзіне XIX — пачатку XX ст. пражывала на тэрыторыі Полацкага павета. У сярэдзіне XIX ст. у павеце налічвалася каля паловы ўсіх прыхільнікаў «старой веры», што фіксаваліся ў беларускай частцы Віцебскай губерні. На пачатку XX ст. доля стараверaў Полацкага павета ад агульнай колькасці па беларускай частцы Віцебскай губерні зменшылася да адной трэці. На тэрыторыі павета пражывалі ў асноўным стараверы-беспапоўцы. У сярэдзіне XIX — пачатку XX ст. большасць стараверскага насельніцтва

рэгіёна з'яўлялася вясковымі жыхарамі. Але пры гэтым у горадзе Полацку на працягу ўсяго даследуемага перыяду таксама налічвалася значная колькасць стараавераў.

## Літаратура і крыніцы


1. *Варадинов, Н. В.* История Министерства внутренних дел. — СПб. : Тип. МВД. — 8 т. 8-ая, дополнительная книга : История распоряжений по расколу. — 1863. — [2], VI, IV, 656 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 1430. — Воп. 1. — Спр. 7602.
3. НГАБ. — Ф. 1430. — Воп. 1. — Спр. 8095.
4. НГАБ. — Ф. 1430. — Воп. 1. — Спр. 10543.
5. НГАБ. — Ф. 1430. — Воп. 1. — Спр. 11171
6. НГАБ. — Ф. 1430. — Воп. 1. — Спр. 46554.
7. НГАБ. — Ф. 1430. — Воп. 1. — Спр. 52098.
8. Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 г. / Ред. А. М. Сементовский. — Санкт-Петербург : Тип. К. Вульфа. — [4], II, 499 с.
9. Памятная книжка Витебской губернии на 1863 год. — Витебск : Тип. губ. правл., [б. г.]. — [1], 7, 642, 57 с.
10. Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год. — СПб. : Тип. К. Вульфа, 1865. — VIII, 376, 128, 7 с.
11. Памятная книжка Витебской губернии на 1867 год. — СПб. : Тип. К. Вульфа, 1867. — VIII, 319, 118 с.
12. Памятная книжка Витебской губернии на 1884 год. — Витебск : Тип. губ. правл., 1884. — V, 329 с.
13. Памятная книжка Витебской губернии на 1888 год. — Витебск : Губ. тип., 1888. — V, 195, 118, XIV, 150, XIV с.
14. Памятная книжка Витебской губернии на 1898 год. — Витебск : Губ. тип., 1898. — [2], IV, 43, 138, 343 с.
15. Памятная книжка Витебской губернии на 1904 год. — Витебск : Губ. типо-лит., 1903. — VIII, 32, 256, 119, 19 с.
16. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. / Изд. Центр. Стат. комитетом М-ва вн. дел; Под ред. Н. А. Тройницкого. — СПб. : Тип. Т-ва «Народная польза». — [Вып.] 5: Витебская губерния. — Тетрадь 3. — 1903. — [4], XIV, 283 с.
17. Полоцкие епархиальные ведомости. — 1911. — № 17. — 24 апреля.
18. Сведения о населенных местах Витебской губернии, собранные губернским статистическим комитетом МВД по предписанию Министра внутренних дел от 9 апреля 1859 г., для подготовки издания Полного списка населенных мест Российской Империи. Часть II [Дело] : 1866 г. — 614 л. (РГИА. Ф. 1290. Оп. 4. Д. 103). [Электронный ресурс]. — Режим доступа : https://www.prlib.ru/item/466671.
19. Собрание постановлений по части раскола ; 2-е изд., испр. и доп. — Санкт-Петербург : Тип. министерства внутренних дел, 1875. — [4], 694, 65 с.
20. Церковь : старообрядческий церковно-общественный журнал. — 1908. — № 18. — 4 мая.
21. Церковь : старообрядческий церковно-общественный журнал. — 1908. — № 31. — 3 августа.

22. Церковь : старообрядческий церковно-общественный журнал. — 1908. — № 32. — 10 августа.
23. Церковь : старообрядческий церковно-общественный журнал. — 1908. — № 33. — 17 августа.
24. Церковь : старообрядческий церковно-общественный журнал. — 1908. — № 35. — 32 августа.

## *U. Y. Ouseichik*. THE OLD BELIEVERS OF POLOTSK UYEZD IN THE MIDDLE OF THE NINETEENTH AND EARLY TWENTIETH CENTURIES: PECULIARITIES OF SETTLEMENT AND DEMOGRAPHIC CHARACTERISTICS

*The article covers the peculiarities of the Old Believers' population settling in the Polotsk district of the Vitebsk province in the middle of the XIXth — beginning of the XXth century. The main habitats are revealed, the dynamics of the number of the Old Believers is traced. The sources for this research are statistic materials and archival data.*

Keywords: *Old Believers, ethnic groups, Belarus, settlement, demography, ethnocultural processes.*